*П.Ю. Булаты*

# Жыццё Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі на фотаздымках з часопісу «Воскресное чтение»

У артыкуле публікуюцца фотаздымкі, якія былі змешчаныя на старонках часопісу «Воскресное чтение» – афіцыйным друкаваным органам Праваслаўнай Царквы ў Польшчы міжваеннага часу. Прыводзіцца іх апісанне і аналіз, тэматычнае размеркаванне. Прыведзеныя здымкі адлюстроўваюць разнастайныя накірункі жыцця і дзейнасці Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі.

***Ключевые слова:*** фотаздымкі, перыядычнае выданне, «Воскресное чтение», Польская Праваслаўная аўтакефальная Царква, Заходняя Беларусь, царкоўная гісторыя.

Згодна з Рыжскім мірным дагаворам, заключаным ў 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, заходнія землі Беларусі былі далучаныя да Польскай дзяржавы. У 1922 г. ва ўмовах папярэдняга разрыву сувязяў з Рускай Праваслаўнай Царквой была абвешчана аўтакефалія Польскай Праваслаўнай Царквы (ПАПЦ). У 1924 г. ПАПЦ атрымала прызнанне Канстанцінопальскім патрыярхатам. Адпаведна яе юрысдыкцыя распаўсюджвалася на землі Заходняй Беларусі, якія ахоплівалі створаныя Віленская, Гродзенская і Палеская епархіі.

Афіцыйным друкаваным органам Праваслаўнай Царквы ў Польшчы з’яўляўся часопіс «Воскресное чтение», які рэгулярна выдаваўся ў Варшаве на рускай мове. Першы нумар часопісу пабачыў свет 20 (7) студзеня 1924 г., а апошні выйшаў напярэдадні Другой

сусветнай вайны 27 жніўня 1939 г. На старонках часопісу ўсебакова адлюстроўвалася тагачаснае царкоўнае жыццё; з яго можна даведацца пра падзеі палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця, убачыць настроі і актуальныя праблемы пэўных пластоў грамадства. Але перад усім, штотыднёвае выданне утрымлівае грунтоўны матэрыял па гісторыі Праваслаўнай Царквы ў міжваенны час. Так, часопіс падае інфармацыю аб выдадзеных законах, загадах і пастановах (як свецкай улады ў галіне царкоўнага жыцця, так і органамі царкоўнага кіравання), распараджэннях епархіяльнага кіраўніцтва, якія датычацца духавенства (рукапалажэнні, перамяшчэнні, прызначэнні, узнагароды і спагнанні, некралогі) і царкоўнага ўладкавання, а таксама фінансавыя справаздачы, справаздачы кансісторый і семінарый. Апроч таго, на старонках «Воскресного чтения» друкаваліся актуальныя навіны з жыцця Царквы, замежная хроніка (асабліва звярталася ўвага на царкоўнае жыццё ў СССР), епархіяльная карэспандэнцыя, багаслоўскія і душпастырскія творы, навуковыя артыкулы Мітрапаліта і прафесараў Праваслаўнага Багаслоўскага факультэта, матэрыялы з пропаведзямі і навучальнымі сачыненнямі святароў, мастацкія творы, аўтарскія эсэ, свецкая навукова-папулярная публіцыстыка, рэклама.

Адметнасцю часопісу «Воскресное чтение» з’яўляецца прысутнасць на яго старонках ілюстрацый. Пераважная большасць ілюстраванага матэрыялу датычыцца малюнкаў рэлігійнага зместу – выявы святых і евангельскія сюжэты, якія адпавядалі царкоўнаму святу напярэдадні якога выходзіў часопіс (як правіла, змяшчаліся на першай старонцы), літаграфіі ікон, ілюстрацыі да багаслоўскіх тэкстаў. Аднак меў месца і багаты фатаграфічны матэрыял. Часопісная фотакарэспандэнцыя адлюстроўвала царкоўнае жыццё розных накірункаў і мела шырокі геаграфічны ахоп: публікаваліся здымкі з падзей у Варшаве, з епархій Заходняй Беларусі і Украіны, а таксама з замежжа.

У нашым даследаванні ўвага засяроджваецца на фатаграфічным матэрыяле, звязаным з падзеямі, асобамі і месцамі, датычнымі да епархій, якія ахоплівалі землі сучаснай Беларусі. Тэматычна

выяўленыя фотаздымкі можна ўмоўна[1] размеркаваць на тры групы: 1) здымкі, звязаныя з духавенствам; 2) здымкі, якія адлюстроўваюць царкоўнае жыццё; 3) фатаграфіі царкоўнай архітэктурнай спадчыны.

Дададзім, што ў сучасным беларускім крыніцазнаўстве часопіс «Воскресное чтение» з'яўляецца гістарыяграфічнай рэдкасцю і маладаступны айчынным даследчыкам. У бібліятэчных і архіўных зборах краіны прадстаўлена неверагодна маленькая колькасць нумароў выдання. Амаль поўны камплект часопісу, які налічвае каля 800 нумароў (з улікам дадаткаў), захоўваецца ў зборах бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта (Biblioteka Uniwersytecka w Warszawie) і Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы (Biblioteka Narodowa)[2]. Таксама адзначым, што, па словах даследчыцы царкоўнага друку Л. Шчавінскай, нічога падобнага да ілюстраванага штотыднёвіка «Воскресное чтение», які выходзіў са шматлікімі і разнастайнымі дадаткамі, у міжваенным сусветным славянскім праваслаўным асяродку не існавала[3]. Унікальнасць самаго часопісу і яго рэдкасць робяць прадстаўлены фатаграфічны матэрыял значнай і адметнай крыніцай па царкоўнай гісторыі рознага накірунку на беларускіх землях. Разгледзім іх падрабязней.

## I

Да першай групы вылучаных здымкаў былі аднесены фатаграфіі прадстаўнікоў тагачаснага духавенства. У дадзенай групе можна вылучыць падкатэгорыі: 1) здымкі мітрапаліта і прадстаўнікоў кіруючых царкоўных колаў; 2) студэнты і выпускнікі духоўнай семінарыі, Варшаўскага ўніверсітэта.

Найбольшая колькасць здымкаў[4], натуральна, звязана з асобаю кіраўніка Польскай аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы – мітра-

1 Умоўнасць прыведзенай класіфікацыі заключаецца ў тым, што тэматыка здымкаў можа ахопліваць і некалькі з вылучаных намі тэматычных накірункаў.
2 Прадстаўленыя ў публікацыя фотаздымкі ўзяты менавіта з камплектаў часопісу, якія захоўваюцца ў адзначаных бібліятэках г. Варшавы.
3 Щавинская, Л.Л. Книги и брошюры крупнейшего православного издательского центра межвоенной Польши – Варшавской Синодальной типографии / Л.Л. Щавинская // Славяноведение. – 1998. – № 1. – С.76.
4 У рамках нашага даследавання мы змесцім толькі некаторыя (асабістыя) з прыведзеных на старонках часопісу.

палітам Дзіянісіям (у свецкім грамадстве Канстанцін Мікалаевіч Валядзінскі, 1876–1960 гг.). Фотаздымкамі архірэя суправаджаліся матэрыялы, звязаныя з яго публічнай дзейнасцю: міжнародныя сустрэчы і паездкі, сустрэчы ва ўрадзе Польшчы, удзел у дзяржаўных і царкоўных урачыстасцях і інш. Таксама фотапартрэт ўладыкі (фота 1)[5] змяшчаўся пры публікацыі яго адозваў з нагоды царкоўных і дзяржаўных свят, пры публікацыі яго аўтарскіх матэрыялаў.



***Фота 1.*** *Партрэт мітрапаліта Дзіянісія*

[5] Воскресное чтение. – 1933. – 24 апреля. – Обложка.

Звернем нашу ўвагу на матэрыял, прысвечаны непасрэдна іерарху. У 1937 г. адзначалася 40-годдзе царкоўна-грамадскай дзейнасці Мітрапаліта[6], у сувязі з чым на старонках часопісу выйшаў вялікі панегірычны артыкул з апісаннем жыцця і дзейнасці ўладыкі[7]. Суправаджаўся матэрыял архіўнымі здымкамі (фота 2, фота 3)[8].



***Фота 2.*** *К.М. Валядзінскі (1896 г.), апошні год навучання ва Уфімскай духоўнай семінарыі*

[6] Адлік вёўся ад моманту манаскага пострыгу К.М. Валядзінскага 14 (27) верасня 1897 г.

[7] Воскресное чтение. – 1937. – № 39. – С. 530.

[8] Воскресное чтение. – 1937. – № 39. – С. 530–531.



***Фота 3.1.*** *Ierадыякан Дзіянісій (кастрычнік 1897 г.), Казанская Духоўная акадэмія*
***Фота 3.2.*** *Ierадыякан Дзіянісій (снежань 1897 г.). г. Масква*

Прыводзіліся на старонках часопісу фотаздымкі правячых архірэяў ПАПЦ. Звернем увагу на здымак (фота 4), зроблены на паседжанні Св. Сабору Епіскапаў, які адбываўся 13 лютага 1939 г.[9] Адметнасць і каштоўнасць гэтага здымку ў тым, што ён зроблены перад самым пачаткам Другой сусветнай вайны і на ім заўражаны апошні склад Сабору Архірэяў Праваслаўнай Царквы ў даваеннай Польшчы. У час вайны і пасля яе структура ПАПЦ кардынальным чынам змянілася. Па-рознаму пад час вайны і пасля яе склаліся і лёсы прысутных на здымку архірэяў. На Саборы прысутнічалі: мітрапаліт *Дзіянісій* (у цэнтры; пасля вайны быў адхілены ад пасады мітрапаліта), ад яго па правую руку: архіепіскап Віленскі і Лідскі *Феадосі* (1864–1943; памёр у сане архіепіскапа на пакоі), архіепіскап Валынскі і Крэмянецкі *Алексій*[10] (1882–1943; забіты пад час вайны),

[9] Воскресное чтение. – 1939. – № 8.
[10] З 1923 па 1934 гг. з’яўляўся главою Гродзенскай епархіі

епіскап Камень-Кашырскі *Антоній* (1887–1954; па вайне застаўся ў СССР, арыштаваны ў 1951 г.), епіскап Люблінскі *Цімафей* (1901–1962; пасля вайны заставаўся на кіруючых пасадах Польскай Праваслаўнай Царквы), епіскап Браслаўскі *Матфей* (1894–1985; памёр у эміграцыі); ад мітрапаліта па левую руку: архіепіскап Палескі і Пінскі *Аляксандр* (1887–1948; трагічна загінуў у эміграцыі), епіскап Гродзенскі *Сава* (1898–1951; памёр у эміграцыі), епіскап Астрожскі *Сімяон* (1888–1966; застаўся ў СССР, быў арыштаваны ў 1944 г., па вызваленні ў 1954 г. служыў ва ўкраінскіх епархіях РПЦ), епіскап Луцкій *Палікарп* (1875–1973; памёр у эміграцыі).

У структуры ПАПЦ вылучалася і дзейнічала з 1928 г. Эмерытальная каса, якая выплачвала пенсіі перастарэламу духавенству,



***Фота 4.*** *Паседжанне Св. Сабору Епіскапаў Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. 13 лютага 1939 г.*



***Фота 5.*** *З'езд ўдзельнікаў Эмерытальнай касы праваслаўнага духавенства Польшчы. 26–29 лістапада 1935 г.*

удовам і сіротам[11]. Бюджэт касы фармаваўся з прыходскіх выплат, яе падрабязныя фінансавыя справаздачы штогод друкаваліся на старонках часопісу. Перыядычна ў Варшаве ладзіўся сход удзельнікаў Эмерытальнай касы, падчас працы якога рабіўся агульны фотаздымак. Так, на здымку (фота 5) са з'езду ўдзельнікаў Эмерытальнай касы праваслаўнага духавенства Польшчы (рэвізійная камісія і супрацоўнікі касы), які адбываўся 26–29 лістапада 1935 г.[12], прысутнічалі[13]: па цэнтры мітрапаліт *Дзіянісій*, праваруч ад яго сядзяць – архіепіскап Палескі *Аляксандр*, прот. *С. Грушко*, архім. *Феафан*, прот. *А. Субоцін*; леваруч ад Мітрапаліта – архіепіскап Валынскі *Алексій*, архім. *Паладзій*, прот. *С. Севбо*, прот. *М. Буховіч*; стаяць злева направа: прот. *Самайловіч*, прот. *Д. Перапечкін*, прот.

[11] Скурат, К.Е. История Поместных Православных Церквей / К.Е. Скурат. – Киев, 2012. – С. 308.

[12] Воскресное чтение. – 1935. – № 23. – С. 313.

[13] Асобы пазначаюцца згодна з прыведзенымі дадзенымі пад апублікаваным у часопісе фота.

*І. Карвоўскі*, прот. *Д. Сайковіч*, прот. *І. Каваленка*, іер. *В. Альшэўскі*, прот. *Ф. Барэцкі*, іер. *М. Зелянецкі*, прот. *А. Сагайдакоўскі*, прот. *І. Камарэвіч*, іер. *А. Шыманскі*, справавод камітэта *В. Касаноцкі*, бухгалтар *С. Верамчук-Дычко*.



***Фота 6.*** *З'езд ўдзельнікаў Эмерытальнай касы праваслаўнага духавенства Польшчы. 1939 г.*

На здымку (фота 6) са з'езду прадстаўнікоў Эмерытальнай касы, які адбыўся ў 1939 г.[14], бачна, што за гэты час склад яго ўдзельнікаў амаль цалкам абнавіўся. Так, з 22 прысутных на з'едзе асоб, у 1939 г. адзначана толькі 6 (іх імёны падкрэсленыя). У 1939 г. членамі рэвізійнай камісія і супрацоўнікамі касы з'яўляўся агулам 21 чалавек. Злева направа сядзяць: прот. *Р. Ляскоўскі*, прот. *А. Субоцін*, прот. *С. Жукоўскі*, прот. *С. Грушко*, архіепіскап Валынскі і Крэмянецкі *Алексій*, мітрапаліт *Дзіянісій*, епіскап Люблінскі *Цімафей*, архім. *Паладзій*, прот. *Ф. Івацэвіч*, прот. *І. Ярмалюк*. Злева направа стаяць:

[14] Воскресное чтение. – 1939. – № 8.

пісар *Сідзь*, бухгалтар *Верамчук*, справавод *Чырко*, іер. *Імшэннікаў*, прот. *Зелянецкі*, іер. *Ю. Грыгаровіч*, прот. *П. Радневіч*, прот. *Г. Мяцюк*, іер. *Жэброўскі*, прот. *М. Каламеец*, прот. *І. Крышпіновіч*.




***Фота 7.*** *Выхаванцы багаслоўскага класа Духоўнай семінарыі ў Вільне, якія скончылі курс навук у чэрвені 1927 г. (лічба ў коле – царкоўнае кіраўніцтва і выкладчыкі, белая лічба – семінарысты)*

Размешчаны ў часопісе калектыўны здымак (фота 7) паказвае склад багаслоўскага класа Віленскай духоўнай семінарыі 1926–1927 гг.[15] На ім прысутнічаюць тагачасныя выкладчыкі і семінарысты, змешчаныя фота мітрапаліта *Дзіянісія* (1) і архіепіскапа Віленскага і Лідскага *Феадосія* (2). Вызначыць выкладчыкаў на здымку дапамагаюць мемуары аднаго з тагачасных семінарыстаў Яўстафія Баслыка[16]. Так, рэктарам семінарыі з'яўляўся прот. *Мікалай Тучэм-*

[15] Воскресное чтение. 1937 – № 32. – С. 380.
[16] Баслык, Е. Записки священника Евстафия / Евстафий Баслык. – Минск : Лучи Софии, 2005. – 256 с.

*скі* (3), прот. *Іосіф Дзічкоўскі* (4) выкладаў літургіку і дагматычнае багаслоўе, *Андрэй Раманавіч Куц* (5) – выкладчык канонікі і парталогіі, сакратаром семінарыі быў *А.Г. Снежынскі* (6), выкладчык спеваў *Віктар Сцяпанавіч Беер* (7), *Апалон Іосіфавіч Смаржэўскі* (8) выкладаў гісторыю Царквы, асноўнае і параўнальнае багаслоўе.

У часопісе побач з калектыўным здымкам публікаваўся і разрадны спіс навучэнцаў[17]. У залежнасці ад адзнак выхаванцы падзяляліся на дзве групы (І і ІІ разрад), былі і тыя, каму разрад не прысвойваўся (мусілі паўторна здаваць пэўныя дысцыпліны), меліся вольныя слухачы. Так, да І разраду належалі: *Комар Канстанцін* (1), *Імшэннікаў Уладзімір*[18] (2), *Камінскі Канстанцін* (3), святар Яўстафій Баслык (4), *Мяцеліца Канстанцін* (5), святар *Платон Сліж* (6), святар *Георгі Чэшык* (7), *Смірноў Міхаіл* (8), *Яшчынскі Сяргей* (9), *Аляхновіч Усевалад* (10), *Апанасевіч Аляксандр* (11), *Антоній Нарушэвіч* (12), *Копасаў Віталь* (13), Георгі Хільтоў (14); да ІІ разраду былі запісаныя: *Сурвіла Яўген* (15), *Лапатко Аляксандр* (16), *Белашыцкі Мікалай* (17), *Гаўрылаў Уладзімір* (18), *Савіч Антоній* (19), *Строк Іван* (20), дыякан *Іван Жарскі* (21), *Стралкоўскі Аркадзь* (22), *Піліхоўскі Барыс* (23), *Навіцкі Апалон* (24). Без разраду з пазыкамі па дысцыплінах былі: *Давідовіч Мікалай* (25), *Стэфанюк Васілі* (26), *Сотнікаў Іван* (27). Да вольных слухачоў семінарыі належалі: дыякан *Дзмітрый Дарашэвіч* (28), *Віталь Кавалеўскі* (29), *Уладзімір Грыгаровіч* (няма на фота). Акрамя прыналежных да семінарыі асоб на фотаздымку змяшчаецца выява (злева) самой семінарыі і інтэр’ер царквы Св. Тройцы (справа).

Багаслоўскую адукацыю ў міжваенны час можна было атрымаць на аддзяленні евангелічнай тэалогіі і курсаў праваслаўнага багаслоўя (Studium Teologii Prawosławne), што дзейнічалі ў Варшаўскім універсітэце. Дзейнічаць курсы пачалі 8 лютага 1925 г., праца вялася да 1939 г. Навучанне на аддзяленні цягнулася чатыры гады, у гэты час студэнты засвойвалі абавязковыя і факультатыўныя дысцыпліны. За ўвесь час існавання курсаў выпускнікамі было абаронена 249 магістарскіх прац. Пад апекаю мітрапаліта пры курсах дзейнічала Кола праваслаўных багасловаў, а ў 1933 г. паў-

[17] Воскресное чтение. – 1937. – № 32. – С. 381.
[18] Згадваўся намі пры апісанні членаў з’езду Эмерытальнай Царкоўнай касы ў 1939 г.

стала брацтва, якое яднала выпускнікоў[19]. На старонках «Воскресного чтения» час ад часу з'яўляліся матэрыялы, прысвечаныя ўніверсітэцкім курсам, якіясуправаджаліся фотаздымкамі (фота 8)[20], (фота 9)[21], (фота 10)[22]. Апублікаваныя здымкі, на жаль, не маюць пры сабе подпісаў, якія б ідэнтыфікавалі прысутных на іх асоб. Таму звернем увагу толькі на некаторыя з іх, якія адлюстроўваюць розныя аспекты жыцця і дзейнасці Багаслоўскіх курсаў.



***Фота 8.*** *Архіпастыры і студэнты багаслоўскага аддзелу Варшаўскага ўніверсітэту. 1 мая 1933 г. Фота зроблена побач з Кафедральным саборам Марыі Магдалены*

[19] Портнов, А. Студіум православного богослов'я Варшавського університету (1925–1939) / Андрій Портнов // Український археографічний щорічник. – К., 2006. – Вип. 10/11. – С. 386–397.

[20] Воскресное чтение. – 1933. – № 24.

[21] Воскресное чтение. – 1937. – № 28–30. – С. 436.

[22] Воскресное чтение. – 1937. – № 34–35. – С. 468.



***Фота 9.*** *Група студэнтаў з Кола праваслаўных багасловаў падчас традыцыйнай штогадовай экскурсіі на свята Тройцы ў Пачаеў. 1937 г.*



***Фота 10.*** *Выпускнікі багаслоўскіх курсаў, удзельнікі Праваслаўнага брацтва. 1937 г.*

## II

Да другой групы здымкаў мы аднеслі здымкі з карэспандэнцыі, якая асвятляла розныя падзеі царкоўнага жыцця ў епархіях і асобных прыходах.

4 снежня 1928 г. пры царкве Святых Апосталаў Пятра і Паўла ў г. Кобрыне пачало дзейнічаць царкоўнае брацтва Святога Крыжа. У матэрыялах часопісу за 1929 г. апублікаваны здымак з брацкай трапезы (фота 11)[23]. Яго заснавальнік (протаіерэй Аляксей Русецкі)[24] у атачэнні ўдзельнікаў брацтва рэдакцыяй на здымку адзначаны крыжыкам.



***Фота 11.*** *Брацкая трапеза ў Кобрыне.*
*1929 г.*

[23] Воскресное чтение. – 1929. – № 44.

[24] Асоба прот. А. Русецкага досыць цікавая і неардынарная. З'яўляючыся актыўным царкоўным дзеячам, у гады Грамадзянскай вайны ў Расіі А. Русецкі займаў вядучыя царкоўныя пасады ў войску адм. Калчака, меў шэраг высокіх вайсковых узнагарод. У 1920-я – 1930-я гг. займаўся актыўнай царкоўнай дзейнасцю ў прыходах Заходняй Беларусі. Падрабязней: Ильин, А., Игнатюк, Е. Алексей Русецкий. История жизни : в 3-х ч. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.istpravda.ru/bel/research/12949/ – Дата доступа: 05.12.2017.




***Фота 12.*** *Біблейскія курсы ў Баранавічах.*
*Студзень 1934 г.*

У 1930-я ў прыходах ПАПЦ ладзіліся біблейскія курсы, на якіх прыхаджане вывучалі Слова Божае. Фотаздымак такіх курсаў (фота 12) у 1934 г. з г. Баранавічы быў апублікаваны ў штомесячным дадатку да часопісу «Воскресное чтение» «ГОСТЬ»[25]. Фота суправаджалася навінамі ад баранавіцкай супольнасці вернікаў. Так, у карэспандэнцыі брат Шатура паведамляў: «Справа Божая ў нас рухаецца наперад вялікімі крокамі. 4-га сакавіка адбыўся ў Баранавічах раённы сход, на якім было вырашана працу [біблейскіх курсаў – *аўт.*] размеркаваць на дзве абшчыны. Адну з цэнтрам у Баранавічах, а другая, куды ўвойдуць Наваградскі, Стаўпецкі, Баранавіцкі ўезды, – у м. Гадзішча, дзе працуюць браты Скарабагатаў і Фалько»[26].

Істотнае месца ў групе здымках з царкоўнага жыцця займае фотаматэрыял з будаўніцтва і асвячэння новых праваслаўных храмаў. У тагачасных палітычных і сацыяльных умовах узвядзенне новай царквы – складаны працэс, які вымагаў неверагодных фінансавых

[25] Гость. – 1934. – № 5. – С. 61.
[26] Там же. С. 62.

выдаткаў і пераадоленне шэрагу бюракратычных працэдур. Таму ўзвядзенне і асвячэнне новых праваслаўных храмаў – значная падзея ў жыцці Царквы. На старонках часопісу былі выяўлены артыкулы з фотаздымкамі з будаўніцтва цэркваў у Морачы, Заастравеччы, Баранавічах.



***Фота 13.*** *Здымкі запрошанага фатографа Мілера з ўрачыстага асвячэння царквы ў Морачы. 5 чэрвеня 1932 г.: 1. – знешні выгляд храма; 2 – царкоўны хор пад кіраўніцтвам рэгента-дыякана Максіма Рулінскага; 3 – ганаровыя духоўныя і свецкія госці*

*Морач*[27]. 26 снежня 1928 г. у мястэчку Морач (Нясвіжскі ўезд[28]) згарэла Вазнясенская царква. У 1929 г. пры візіце ў мястэчка епіскапа Гродзенскага Алексія было вырашана будаваць новую царкву. Сродкі на будаўніцтва збіраліся прыхаджанамі, паступалі ахвяраванні, была дапамога з казны. Закладзеная 7 мая 1930 г. царква, к вясне 1932 г. была цалкам пабудаваная. Асвячэнне было прызначанае на 5 чэрвеня 1932 г. У гэты дзень у Морачы адбыліся вялікія

[27] Воскресное чтение. – 1933. – № 3. – С. 43–45.
[28] Сучасная вёска Морач, Клецкага р-на.

ўрачыстасці (фота 13), на якіх прысутнічалі 15 протаіерэяў, 7 іерэяў, 2 дыяканы (з прысутных клірыкаў у артыкуле адзначаюцца: Нясвіжскі благачынны прот. Васілі Валасовіч, прот. Рыгор Лукашэвіч, іер. Іван Вернікоўскі). Былі запрошаныя і свецкія саноўныя асобы – староста Нясвіжскага ўезда Е. Цэдзінскі, яго намеснік С. Сіпайла-Рудніцкі, пасол Сейма Г.Г. Шыманоўскі, рэферэнт староства Малюкевіч, паручнік Корпусу аховы П.М. Ехалік. Пасля ўрачыстай літургіі настаяцель царквы прот. Аляксей Касперскі быў узнагароджаны камілаўкам, члены будаўнічага камітэту – архірэйскімі граматамі.



***Фота 14.*** *Асвячэння месца і ўсталяванне крыжа ў м. Заастравечча. Красавік 1933 г.*

*Заастравечча*[29]. Узвядзенне царквы ў мястэчку Заастравечча непасрэдна звязана з падзеямі, апісанымі вышэй ў м. Морач. Пасля пажару 1928 г. месцічы Заастравечча асталіся без прыходскай царквы, аднак прыняць удзел у аднаўленні царквы ў Морачы адмовіліся: было вырашана будаваць новы храм у Заастравеччы. Рашэнне прыхаджан благаславіў епіскап Гродзенскі Алексій. Будаўніцтва матэрыяльна было забяспечана дзякуючы духоўнаму тастаменту ад

[29] Воскресное чтение. – 1933. – № 36. – С. 555–557.

Яўгеніі Шутавай, якая перадала царкве 10 дзесяцін зямлі. Лес для будаўніцтва забяспечыў князь Альбрэхт Радзівіл, пляцоўку пад царкву перадаў месціч Мінец, паступалі ахвяраванні прыхаджан. Асвячэнне месца царквы з тытулам Св. Дзіянісія Арэапагіта і ўсталяванне на ім крыжа адбыліся 23 красавіка 1933 г. (фота 14). Пачаліся ўрачыстасці ў суседняй Астравецкай царкве, адкуль хросным ходам вернікі прыйшлі ў Заастравечча. Ва ўрачыстасцях бралі ўдзел: Нясвіжскі благачынны прот. Васілі Валасовіч, настаяцель В. Лапацінскі, святары М. Хільтоў, І. Герасімовіч, М. Шавель, А. Касперскій, дыяканы І. Янкоўскі, Булойчык, псаломшчык Вярыга.




***Фота 15.*** *Праект Баранавіцкага Пакроўскага сабору*

*Баранавічы*. У маі 1921 г. у горадзе згарэла праваслаўная царква. Адразу ж быў сфармаваны царкоўна-будаўнічы камітэт (старшыня – сенатар А.В. Назарэўскі) і рэвізійная камісія, якія пачалі збор сродкаў на адбудову царквы ў горадзе. Ход будаўніцтва, справаздачы аб выдатках, зафіксаваныя на фота этапы прац – усё гэта штогод адлюстроўвалася ў матэрыялах часопісу. Першы артыкул, датычны Баранавіцкага сабору, з’явіўся ў 1926 г.[30] Там апісваліся падзеі папярэд-

[30] Воскресное чтение. – 1926. – Апрель.

ніх гадоў (пажар, пошук сродкаў, закладанне храма ў жніўні 1924 г.) і публікаваўся план сабора (фота 15), складзены архітэктарам Абаленскім (самімі працамі кіраваў інжынер І.В. Стакоўскі). Таксама ў артыкуле давалася справаздача аб паступленнях і выдатках па стане на 1924 і 1926 гг.




***Фота 16.*** *Будаўніцтва царквы ў Баранавічах. 1928 г.*

У 1929 г. у «Воскресном чтении» была апублікаваная вялікая фотасправаздача з будоўлі (фота 16) за 1928 г.[31] На ёй адлюстраваны ход будаўнічых прац над скляпеннямі бакавых прытвораў (1, 2), працы над мураваным перакрыццём пад купалам (3), якія вяліся ў жніўні 1928 г., узвядзенне рашатавання купала (7, 8), прыводзіцца агульны від храма па стане на верасень–снежань 1928 г. (4, 9). Цікавым з’яўляецца агульны здымак членаў царкоўна-будаўнічага

[31] Воскресное чтение. – 1928. – № 16. – С. 250.

камітэту (6). Дакладна вядома, што на фота ў цэнтры сядзіць сенатар Аляксей Віктаравіч Назарэўскі, побач з ім (праваруч) – настаяцель сабору прот. Павел Мацкевіч. Са звестак аб узнагародзе членаў камітэту архірэйскімі граматамі і лістамі падзякі па заканчэнні будаўніцтва[32], вядома, што ў склад камітэту, апроч сенатара і настаяцеля, уваходзілі: царкоўны стараста Г.Ф. Яроцкі (па выніках узнагароджаны кафтанам старасты), М.І. Канадо, А.А. Пронін, С.А. Жыткоўскі, І.І. Бахар (сакратар), А.І. Аляшкевіч, Ф.Г. Кляша, П.Л. Альшэўскі, В.В. Зелянеўскі, В.Э. Казакевіч, К.В. Брыша, Ул. І. Сусленікаў.




***Фота 17.*** *Будаўнічыя працы ў 1929–1930 гг.*

Будаўнічы сезон 1929 г. быў апісаны ў публікацыі 1930 г.[33] Да гэтага часу купал храма быў ацынкаваны, шар на купале пакрыты меддзю, узведзеная алтарная апсіда і два порціка над вонкавымі калонамі, пафарбаваныя летнія і зімнія аконныя рамы, устаўленае

[32] Воскресное чтение. – 1931. – 8 октября.
[33] Воскресное чтение. – 1930. – № 8. – С. 124.

шкло. Да справаздачы далучана два здымкі (фота 17) – з агульным выглядам і з акцэнтам на выгляд завершанага купалу (1, 2).

У 1930 г.[34] былі ўзведзеныя два паверхі званіцы, накрытыя часовым дахам. Стан будоўлі прыводзіўся на фотаздымку ў справаздачы (3). Адзначалася, што агулам на будаўніцтва сабору было выдаткавана 21000 злотых, атрымлівалася дадатковая субсідыя ў 5000 злотых.

Урачыстае асвячэнне Свята-Пакроўскага сабору адбылося ў нядзелю 4 кастрычніка 1931 г. Праводзіў яго асабіста Архіепіскап Гродзенскі Алексій[35]. Адзначым, што ў часопісе анансуецца публікацыя матэрыялу з падрабязным апісаннем урачыстасці ў Баранавічах, аднак, па невядомых прычынах, ён так і не з’явіўся на старонках «Воскресного чтения»[36]. Таксама дададзім, што ў артыкулах часопісу не згадваюцца мазаікі, якія былі прывезеныя ў Баранавічы са зруйнаванага ў Варшаве сабору Св. А. Неўскага[37].

## III

Да трэцяй групы фотаздымкаў, апублікаваных у часопісе, намі былі аднесеныя выявы архітэктурнай спадчыны Праваслаўнай Царквы – знешні выгляд цэркваў, іх інтэр’еры. Варта адзначыць, што фотаздымкі адзначанай рубрыкі маюць шырокі геаграфічны дыяпазон, ахопліваючы рэлігійныя цэнтры і парафіі Заходняй Беларусі, Украіны, усходняй Польшчы, замежных краін (як правіла, з памесных Праваслаўных Цэркваў). У рамках нашай працы былі адабраны здымкі, звязаныя з беларускімі прыходамі. Фатаграфіі цэркваў публікаваліся як асобна, так і суправаджаючы адмысловыя тэматычныя артыкулы.

На старонках часопісу за 1925 г. быў апублікаваны здымак кафедральнага Свята-Фёдараўскага сабору ў Пінску (фота 18)[38]. Будынак храма быў узведзены ў XVIII ст. і да 1857 г. належаў да каталіцкага

[34] Воскресное чтение. – 1931. – № 14. – 2 форзац.
[35] Воскресное чтение. – 1931. – № 41. – С. 584.
[36] Аб урачыстасцях 4 кастрычніка 1931 г. у Баранавічах пісала газета Słowo. – 1931. – Nr. 224. – S. 3.
[37] Баранавіцкі Пакроўскі сабор // Архітэктура Беларусі : Энцыклапедычны даведнік. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1993. – С. 67.
[38] Воскресное чтение. –1925. – № 8. – С. 118.

кляштару дамініканцаў. Пасля перадачы праваслаўным царква была перабудаваная і набыла выгляд, адлюстраваны на фота. Знаходзіўся сабор на вул. Саборнай (сучасная вул. Горкага). У 1920–1930-я гг. царква з'яўлялася галоўным храмам Пінскай епархіі. У 1939 г. святыня значна пацярпела, а ў 1949 г. была зруйнавана савецкай уладай. У 1990-я месца старажытнай святыні заняў новы праваслаўны храм[39].



***Фота 18.*** *Свята-Фёдараўскі сабор у г. Пінску. 1925 г.*

[39] Звесткі паводле афіцыйнага сайту Пінскай і Лунінецкай епархіі [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://pinskeparh.by/ – Дата доступа: 05.12.2017.

1925 годам датаваная публікацыя здымку Свята-Пакроўскага Кафедральнага сабору ў Гродна (фота 19)[40]. Узвядзенне царквы як гарнізоннай, пачалося ў 1904 г., да 1907 г. будаўніцтва было завершана. Пасля закрыцця ў 1921 г. Гродзенскага кафедральнага Сафійскага сабора Свята-Пакроўскі сабор становіцца галоўным храмам епархіі і прымае найменне кафедральнага[41]. Побач са здымкам знешняга выгляду храма публікаваўся здымак сабroom інтэр'еру, аднак з-за вельмі кепскай якасці мы не прыводзім яго выяву.



***Фота 19.*** *Гродзенскі кафедральны Свята-Пакроўскі сабор. 1925 г.*

Цікавасць выклікае здымак Свята-Раства-Багародзіцкай царквы ў в. Мураванка (Маламажэйкаўская царква; фота 20)[42] – выбітны помнік культавай абарончай пабудовы мяжы XV–XVI ст. У 1920-я г. польскія ўлады распачалі працэс вяртання раней забраных каталіцкіх храмаў. Але

[40] Воскресное чтение. – 1925. – № 17. – С. 259.
[41] Рой, Г. История Свято-Покровского кафедрального собора / Георгий Рой. – [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://pokrovgrodno.org/ru/history – Дата доступа: 05.12.2017.
[42] Воскресное чтение. – 1925. – № 29. – С. 462.



***Фота 20.*** *Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў в. Мураванка (Маламажэйкаўская царква). 1925 г.*

разам з былымі касцёламі час ад часу рабіліся спробы адабрання цэркваў, якія з'яўляліся раней уніяцкімі і ніколі не былі рыма-каталіцкімі. На жаль, патрапіла ў гэты лік і Маламажэйкаўская царква, хоць вакол яе ў той час пераважала праваслаўнае насельніцтва[43]. Справа аб перадачы царквы актыўна адлюстроўвалася на старонках часопісу. Апублікаваны здымак паказвае апошнія яе месяцы прыналежнасці да Праваслаўя. Але галоўная яго каштоўнасць у тым, што побач з царквой заўражаны святар – 85-гадовы Леў Савіцкі, які з 1863 па 1926 гг. быў настаяцелям царквы і зрабіў неацэнны ўнёсак ў яе падтрыманне і захаванне.

Адметным з'яўляецца і фотаздымак інтэр'еру царквы Св. Дзмітрыя Салунскага ў Шчорсах (фота 21)[44], зафіксаваны ў 1929 г. У 1920-я царква сур'ёзна пацярпела ад пажару, але была адноўленая і 21 лістапада і 1929 г. асвечаная. Каштоўнасць адлюстраванага на фота інтэр'еру ў тым, што у кан. 1950-х гг. храм быў зачынены, у ім змяшчаліся спартыўная зала, зернясховішча. Адпаведна, ранейшыя інтэр'еры былі

[43] Лаўрэш, Л.Л. Маламажэйкаўская царква: гістарычны нарыс / Л.Л. Лаўрэш. – Гродна : «ЮрСаПрынт», 2017. – 114 с.

[44] Воскресное чтение. – 1930. – № 9.



***Фота 21.*** *Унутраны выгляд царквы Св. Дзмітрыя ў Шчорсах. 21 лістапада 1929 г.*

страчаныя, пры аднаўленні царквы ў 1988 г. унутранае ўбранства выканана нанова[45].

Змешчаны на старонках «Воскресного чтения» і здымак (фота 22)[46] адной з галоўных беларускіх праваслаўных святынь – Свята-Успенскага манастыра ў Жыровічах. Фота 1937 г. суправаджала серыю аўтарскіх матэрыялаў Я. Вадзімава[47] «Перед Зарёю Незаходящего Солнца», прысвечаных гісторыі і тагачаснасці манастыра ў Жыровічах[48].

Такім чынам, разгледзеўшы фотаматэрыял у часопісе «Воскресное чтение», які з'яўляецца бібліяграфічнаю рэдкасцю, можна адзначыць наступнае:

1) тэматыка здымкаў, якія датычацца беларускіх епархій Польскай аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, прадстаўлена ў трох трох звязаных між сабою групах: духавенства, падзеі, спадчына;

45 Звесткі паводле афіцыйнага сайту Навагрудскай епархіі [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.eparhia.by/prikhody/novogrudskoe-blagochinie/shchorsy.html – Дата доступа: 05.12.2017.

46 Воскресное чтение. – 1937. – № 22. – С. 357.

47 Творчы псеўданім рускага пісьменніка Юрыя Іпалітавіча Лісоўскага.

48 Воскресное чтение. – 1937. – № 25. – С. 395; Воскресное чтение. – 1937. – № 26. – С. 409.



***Фота 22.*** *Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр. 1937 г.*

2) здымкі з групы, прысвечанай духавенству, ахопліваюць яго шырокія колы: прадстаўлены выявы кіраўніцтва царквы (у асобе Мітрапаліта Дзіянісія), Архіпастыраў і пастыраў. Адметнымі з'яўляюцца здымкі выхавальнікаў духоўных установаў, якія склалі аснову прыходскага тагачаснага духавенства;

3) з прыведзеных падзейных здымкаў, большасць датычыцца ўзвядзення і асвячэння новых праваслаўных цэркваў, што ў тагачасных палітычных і сацыяльных умовах з'яўлялася сапраўды значнай падзеяй. Асвятлялася часопісам іншая дзейнасць – дзейнасць брацтваў, супольнасцей вернікаў;

4) фатаграфіі ўзораў царкоўнай спадчыны з'яўляюцца найбольш каштоўнымі, у сувязі з тым, што на іх зафіксаваны стан помнікаў 1920-х – 1930-х гг. Частка з іх была зруйнавана і знікла, многія перабудаваныя, выгляд іх змяніўся.

Усё гэта робіць фатаграфічныя матэрыялы часопісу «Воскресное чтение» значнай крыніцай па гісторыі Праваслаўнай Царквы міжваеннага часу. Апублікаваны матэрыял можа стаць базай і грунтам для далейшых даследаванняў у разнастайных галінах.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Słowo. – 1931. – Nr. 224.
2. Баранавіцкі Пакроўскі сабор // Архітэктура Беларусі : Энцыклапедычны даведнік. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1993.
3. Баслык, Е. Записки священника Евстафия / Евстафий Баслык. – Минск : Лучи Софии, 2005. – 256 с.
4. Воскресное чтение. – 1925. – № 17.
5. Воскресное чтение. – 1925. – № 29.
6. Воскресное чтение. – 1925. – № 8.
7. Воскресное чтение. – 1926. – Апрель.
8. Воскресное чтение. – 1928.– № 16.
9. Воскресное чтение. – 1929. – № 44.
10. Воскресное чтение. – 1930. – № 8.
11. Воскресное чтение. – 1930. – № 9.
12. Воскресное чтение. – 1931. – № 14.
13. Воскресное чтение. – 1931. – 8 октября.
14. Воскресное чтение. – 1931. – № 41.
15. Воскресное чтение. – 1933. – № 24.
16. Воскресное чтение. – 1933. – 23 апреля.
17. Воскресное чтение. – 1933. – № 3.
18. Воскресное чтение. – 1933.– № 36.
19. Воскресное чтение. – 1935. – № 23.
20. Воскресное чтение. – 1937. – № 22.
21. Воскресное чтение. – 1937. – № 25.
22. Воскресное чтение. – 1937.– № 28–30.
23. Воскресное чтение. – 1937. – № 26.
24. Воскресное чтение. – 1937. – № 32.
25. Воскресное чтение. – 1937. – № 34–35.
26. Воскресное чтение. – 1937. – № 39.
27. Воскресное чтение. – 1939. – № 8.
28. Гость. – 1934. – № 5.

29. Ильин, А.; Игнатюк, Е. Алексей Русецкий. История жизни : в 3-х ч. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.istpravda.ru/bel/research/12949/. – Дата доступа: 05.12.2017.

30. Лаўрэш, Л.Л. Маламажэйкаўская царква: гістарычны нарыс / Л.Л. Лаўрэш. – Гродна : «ЮрСаПрынт», 2017. – 114 с.

31. Официальный сайт Новогрудской епархии [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.eparhia.by/prikhody/novogrudskoe-blagochinie/shchorsy.html. – Дата доступа: 05.12.2017.

32. Официальный сайт Пинской и Лунинецкой епархии [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://pinskeparh.by/. – Дата доступа: 05.12.2017.

33. Портнов, А. Студіум православного богослов'я Варшавського університету (1925–1939) / Андрій Портнов // Український археографічний щорічник. – К., 2006. – Вип. 10/11. – С. 386–397.

34. Рой, Г. История Свято-Покровского кафедрального собора / Георгий Рой. – [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://pokrovgrodno.org/ru/history – Дата доступа: 05.12.2017.

35. Скурат, К.Е. История Поместных Православных Церквей / К.Е. Скурат. – Киев, 2012.

36. Щавинская, Л.Л. Книги и брошюры крупнейшего православного издательского центра межвоенной Польши – Варшавской Синодальной типографии / Л. Щавинская // Славяноведение. – 1998. – № 1. – С. 76–88.

# THE LIFE OF THE ORTHODOX CHURCH IN WESTERN BELARUS IN THE PHOTOS WITH THE MAGAZINE «VOSKRIESNOJE CHTIENIJE»

P. Bulaty

The article published the pictures that posted on the pages of the magazine «Voskriesnoje chtienije» – the official department of the Orthodox Church in Poland of the interwar time. It provides a description and analysis, thematic distribution. The photographs reflect the various directions of life and activities of the Orthodox Church in Western Belarus.

***Keywords:*** photos, periodical, «Voskriesnoje chtienije», The Polish Autocephalous Orthodox Church, Western Belarus, church history.